**М.А.Яцэвіч,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

# СТАНДАРТЫЗАЦЫЯ ПАТРАБАВАННЯЎ І ЗМЕСТУ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ ПА СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ “АЎТАМАТЫЗАВАНЫЯ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ СІСТЭМЫ”

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На сучасным этапе стандартызацыя разглядаецца ў якасці неабходнай умовы уніфікацыі патрабаванняў да ведаў, уменняў і навыкаў, што дазваляе ў выніку ажыццяўляць сертыфікацыю якасці падрыхтоўкі будучага спецыяліста як па спецыяльнасці ў цэлым, так і па асобнай спецыялізацыі і нават вучэбнай дысцыпліне. Яна ажыццяўляецца ў поўнай адпаведнасці з наступнымі асноўнымі нарматыўна-прававымі актамі Рэспублікі Беларусь: Законам аб адукацыі, стандартам “Сістэма ацэнкі адпаведнасці ў галіне адукацыі” і агульнай мадэллю адукацыйнага стандарта. У адпаведнасці з гэтымі нарматыўнымі актамі быў распрацаваны “Дзяржаўны стандарт вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці Г.12.01.00 “бібліятэказнаўства і бібліяграфія”.

Наступнай стадыяй стандартызацыі з’яўляецца распрацоўка падстандартаў (стандартаў прадпрыемства) па спецыялізацыях, якія цалкам грунтуюцца на стандартах па спецыяльнасці.

Распрацаваны падстандарт па спецыялізацыі Г.12.01.07 “аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы (АБІС)" вызначае прызначэнне, структуру і змест яе, а таксама патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі спецыяліста і мінімуму зместу адукацыйнай праграмы. Агульныя патрабаванні, а таксама патрабаванні да ведаў і ўменняў вызначаюцца ў раздзеле 7 Дзяржаўнага стандарта вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці Г.12.01.00 “бібліятэказнаўства і бібліяграфія”.

У падстандарце вызначана, што спецыяліст па спецыялізацыі "АБІС" прызначаецца для арганізацыйна-тэхналагічнай дзейнасці па праектаванні, стварэнні, эксплуатацыі і падтрымцы аўтаматызаваных бібліятэчных сістэм.

Аб'ектам яго прафесійнай дзейнасці з'яўляюцца бібліятэкі розных тыпаў і відаў, у якіх ужо існуюць або толькі ўкараняюцца аўтаматызаваныя сістэмы.

Патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў спецыяліста і адпаведны пералік дысцыплін спецыялізацыі выпрацаваны з улікам:

— вопыту ўкаранення сучасных інфармацыйных тэхналогій ў бібліятэках эканамічна развітых дзяржаў свету;

— развіцця глабальных камп'ютэрных сетак;

— стану і праблем інфарматызацыі ў бібліятэках Беларусі;

— прапаноў вядомых беларускіх спецыялістаў-практыкаў у галіне аўтаматызацыі бібліятэк;

— стану матэрыяльна-тэхнічнай базы Беларускага універсітэта культуры і магчымасцей правядзення заняткаў па асобных дысцыплінах у бібліятэках.

У выніку было ўказана, што спецыяліст па спецыялізацыі "АБІС" павінен

ведаць:

— сучасныя дасягненні ў галінах вылічальнай тэхнікі і праграміравання;

— асноўныя падыходы да фармалізацыі і алгарытмізацыі апрацоўкі інфармацыі з выкарыстаннем матэматычных і статыстычных метадаў аналізу;

— тэорыю АБІС і сетак, іх арганізацыйную і функцыянальную структуры, этапы праектавання;

— сродкі забеспячэння АБІС (інфармацыйныя, праграмныя, лінгвістычныя, тэхнічныя);

— асаблівасці функцыяніравання лакальных, размеркаваныя і глабальныя камп'ютэрныя сеткі;

— рынак АБІС і сетак;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— асноўныя нарматыўна-тэхналагічныя і навукова-метадычныя дакументы па праектаванні, стварэнні і эксплуатацыі АБІС;

умець:

— сістэмна прадстаўляць бібліятэкі розных тыпаў і відаў як аб'екты аўтаматызацыі і распрацоўваць для гэтага пэўныя алгарытмы яе ажыццяўлення;

— паставіць задачы і распрацоўваць тэхнічныя заданні (ТЗ) пры праектаванні і ўкараненні АБІС;

— карыстацца рознымі сістэмамі кіравання базамі даных (СКБД);

— выбіраць на інфармацыйным рынку і выкарыстоўваць сродкі тэхнічнага, праграмнага (стандартнага і прыкладнога), а таксама інфармацыйнага і лінгвістычнага забеспячэння для патрэб канкрэтнай бібліятэкі;

— выкарыстоўваць розныя камунікатыўныя фарматы запісу інфармацыі і абмену даных (USMARC, UNIMARC, BELMARC) у аўтаматызаваных сістэмах і сетках;

— ствараць структуры дакументальных і фактаграфічных баз даных і адпаведнае лінгвістычнае забеспячэнне;

— працаваць у рэжыме камп'ютэрнай бібліятэчнай сеткі;

— эксплуатаваць і падтрымліваць дзеючую АБІС;

мець вопыт:

— перадпраектнага абследавання бібліятэкі і складання тэхнічнага задання на выбраны тып АБІС;

— складання пераліку функцый і тэхналагічных працэсаў для аўтаматызацыі і распрацоўкі арганізацыйнай і тэхналагічнай структур АБІС;

— распрацоўкі схем (структур), уваходных і выхадных фарматаў дакументальных і фактаграфічных баз даных;

— уводу (загрузкі) дакументаў у электронны каталог, іншыя базы даных;

— працы на аўтаматызаваных рабочых месцах (АРМ);

— эксплуатацыі камп'ютэрных бібліятэчных сетак;

— арганізацыі тэндэра пры выбары сродкаў праграмнага і тэхнічнага забеспячэння АБІС;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— ажыццяўлення ўліку і кантролю розных аб'ектаў аўтаматызацыі.

Патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў спецыяліста вызначылі адпаведны пералік дысцыплін спецыялізацыі (гл.табліцу) з улікам таго, што на іх адведзена 400 вучэбных гадзін згодна з дзеючым вучэбным планам.

Структура вучэбнага плана

| Назва дысцыпліны | Кольк. гадзін | У тым ліку аўдыт. |
|---|---|---|
| 1. Фармалізацыя згортвання тэкставай інфармацыі | 40 | 32 |
| 2. Метады статыстычнага аналізу ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці | 34 | 28 |
| 3. Алгарытмізацыя і праграміраванне бібліятэчна-інфармацыйных задач | 56 | 44 |
| 4. Рынак АБІС | 40 | 32 |
| 5. Лінгвістычнае забеспячэнне АБІС | 50 | 40 |
| 6. Праектаванне АБІС | 86 | 68 |
| 7. Бібліятэчныя камп'ютэрныя сеткі | 50 | 40 |
| 8. Практыкум па стварэнні Web-сайтов | 44 | 36 |
| Усяго | 400 | 320 |

У падстандарце прыведзены мінімум зместу адукацыйнай праграмы па дысцыплінах спецыялізацыі. Ахарактарызуем коратка змест кожнай з дысцыплін.

У курсе "Фармалізацыя згортвання тэкставай інфармацыі" вывучаюцца: неабходнасць і паняцце фармалізацыі згортвання тэкставай інфармацыі; тэкст як аб'ект фармалізацыі згортвання; асноўныя падыходы да аўтаматызацыі анатавання, рэферыравання, фрагментавання і індэксавання; фармалізаванае анатаванне, рэферыраванне і фрагментаванне з выкарыстаннем фармальна-тэкставых прымет; методыкі алгарытмізаванага экстрагіравання.

Асноўныя задачы курса "Метады статыстычнага аналізу ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці" заключаюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў авалоданні студэнтамі статыстычнымі метадамі: непарыўных і рангавых размеркаванняў, ацэнкі параметраў, даследавання статыстычнай структуры выбаркі з дапамогай рангавых размеркаванняў, пабудовы сістэмы дыскрэтных размеркаванняў і ацэнкай іх параметраў, разліку і прагназавання частотнага спектра ў інфарматыцы і бібліятэказнаўстве з выкарыстаннем вылічальнай тэхнікі.

Курс “Алгарытмізацыя і праграміраванне бібліятэчна-інфармацыйных задач” разглядае паняцце алгарытму, яго асноўныя віды, структуры і правілы запісу, праграмнае забеспячэнне для ПЭВМ і мовы праграміравання. У выніку яго вывучэння студэнты павінны авалодаць уменнямі і навыкамі распрацоўкі алгарытмаў і праграм вырашэння бібліятэчна-інфармацыйных задач: уводу інфармацыі ў базы даных, сарціроўкі і індэксіравання, карэкціроўкі інфармацыі, вядзення бібліятэчнай статыстыкі, картатэкі чытачоў і інш.

У курсе “Рынак АБІС” разглядаюцца: асаблівасці праграмнага забеспячэння для аўтаматызацыі бібліятэк, яго віды і месца на інфармацыйным рынку; структура рынку АБІС, пастаўшчыкі, спажыўцы і пасрэднікі на ім; арганізацыйна-прававыя аспекты абароны правоў уласнасці на праграмнае забеспячэнне. Аналізуецца рынак АБІС і камп’ютэрных сетак у эканамічна развітых дзяржавах свету і дзяржавах СНД. Асаблівая ўвага надаецца станаўленню рынку АБІС у Рэспубліцы Беларусь. Ажыццяўляецца параўнальная характарыстыка найбольш распаўсюджаных на ім АБІС. Студэнты авалодваюць методыкай іх выбару на рынку для патрэб канкрэтнай бібліятэкі ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі, а таксама арганізацыяй тэндэра пры набыцці АБІС.

“Лінгвістычнае забеспячэнне АБІС” ставіць перад сабой наступныя мэты: вызначыць паняцце і даць класіфікацыю лінгвістычнага забеспячэння, вывучыць фактары, якія ўздзейнічаюць на яго склад; разгледзець праблемы ўзаемадзеяння і сумяшчальнасці інфармацыйна-пошукавых моў (ІПМ) розных тыпаў і відаў у лінгвістычным забеспячэнні,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблемы лінгвістычнага забеспячэння АБІС у Рэспубліцы Беларусь. Студэнты вучацца распрацоўваць лінгвістычнае забеспячэнне ўваходнага і ўнутранага дакументальнага патокаў, яго склад і структуру, ажыццяўляць актуалізацыю ўнутраных баз даных, а таксама катэгарыяльны аналіз у ІПМ.

Адным з найбольш важкіх у пераліку дысцыплін спецыялізацыі з'яўляецца курс "Праектаванне АБІС", у якім характарызуецца працэс праектавання або ўдасканалення аўтаматызаванай сістэмы, вызначаюцца яе агульныя параметры, этапы праектавання і праектная дакументацыя кожнага этапу. Цэнтральная праблема, якая вывучаецца падчас праектавання, — гэта забеспячэнне інфармацыйнай сумяшчальнасці сістэм. Студэнты займаюцца складаннем тэхнічнага задання як важнейшага этапу праектавання АБІС, распрацоўваюць яе арганізацыйную і функцыянальна-тэхналагічную структуры, праектуюць сродкі праграмнага, інфармацыйнага, лінгвістычнага і тэхнічнага забеспячэння. Значная ўвага надаецца таксама праектаванню баз даных сістэмы: распрацоўцы схемы (структуры) БД, крытэрыяў выбару складу палёў і іх статусу, уваходных і выхадных фарматаў БД і інш. Робіцца ацэнка эфектыўнасці праектуемай АБІС і разлік выдаткаў на яе праектаванне.

Курс "Бібліятэчныя камп'ютэрныя сеткі" мае ў асноўным практычную накіраванасць. У ім студэнты, акрамя тэарэтычнага вывучэння тыпаў, відаў камп'ютэрных сетак, іх кампаноўкі, тапалогіі, сямейства пратаколаў TCP/IP, HTTP і броўзераў Internet, платаў сеткавага адаптэра, асаблівасцей пабудовы бібліятэчных камп'ютэрных сетак, набываюць непасрэдныя тэхналагічныя навыкі работы ў лакальнай бібліятэчнай камп'ютэрнай сетцы, з электроннай поштай і Internet.

Новым курсам у падрыхтоўцы спецыялістаў па спецыялізацыі "Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы" з'яўляецца "Практыкум па стварэнні Web-сайтов", падчас якога студэнты вывучаюць структуру і напаўненне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

WWW-сервера бібліятэк, асноўныя праграмы стварэння Web-старонак (Netscape Composer, MS Front Page, AOL Express, MS Word, MS Publisher), Internet-сайты вядучых бібліятэк свету і авалодваюць практычнымі навыкамі распрацоўкі дызайну (тэкставых і графічных элементаў, элементаў анімацыі, відэа, гуку, тытульнага ліста, галоўнага меню) і размяшчэння Web-сайта канкрэтнай бібліятэкі.

Выкладанне двух апошніх курсаў значна ўскладняецца адсутнасцю ў Беларускім універсітэце культуры асобнага канала выхаду ў Internet, а таксама адпаведнага камп'ютэрнага класа. Таму практычная частка дысцыплін вядзецца ў асноўным у буйнейшых бібліятэках Мінска.

Падстандарт па спецыялізацыі АБІС прайшоў экспертызу ў камітэце па інфармацыйных тэхналогіях Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі і цалкам быў ухвалены. Разам з тым у водгуках на яго звярталася ўвага на неабходнасць паглыбленага вывучэння ў адпаведных існуючых або новых дысцыплінах наступных пытанняў: работы апаратнай часткі ПЭВМ, міжнародных фарматаў і стандартаў запісу і абмену інфармацыяй (UNIMARC, USMARC, BELMARC, Z39.50, ISO 2709) разам з праблемамі і тэхналогіямі канвертацыі, зводныя каталогі як тыповы прыклад камп'ютэрнай бібліятэчнай сеткі, Intranet і Extranet як сродкі доступу і ўзаемадзеяння.

Названыя прапановы будуць улічаны пры ўкараненні новага стандарту па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" і распрацоўцы новага вучэбнага плана, у якім аб'ём вучэбных дысцыплін па спецыялізацыі павялічыцца да 600—800 гадзін. Магчыма, будуць уведзены новыя дысцыпліны ("Архітэктура і канструкцыя ПЭВМ", "Інфармацыйнае ўзаемадзеянне бібліятэк", "Камунікатыўныя фарматы запісу і перадачы даных", "Асновы праграміравання") і ўдакладнены змест і аб'ём існуючых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ